# Васьмёрка пераможцаў —

**Вынікі конкурсу на саісканне прэмій работнікаў культуры, інфармацыі, спорту падвялі на чарговым пасяджэнні Прэзідыума.**

## ЛЯЛЕЧНЫ СВЕТ

У намінацыі **“Тэатральнае мастацтва, экраннае, цыркавое мастацтва”** 15 іншых прэтэндэнтаў апярэдзіў заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь **Магілёўскі абласны тэатр лялек**.

— Надзвычай прыемна і ганарова атрымліваць такую значную ўзнагароду, — дзеліцца ўражаннямі дырэктар установы **Сяргей Бажкоў**. — Цешыць, што сярод канкурэнтаў былі высокапрафесійныя артысты і калектывы, але журы абрала менавіта нас.

У Цэнтральным камітэце прафсаюза тлумачаць: гэты тэатр варты прызнання. Акрамя таго, што тут ставяцца цікавыя лялечныя спектаклі, трупа гастралюе па Беларусі і за яе межамі, удзельнічае ў розных фестывалях і конкурсах, адкуль прывозіць прызы і дыпломы.

Сярод апошніх узнагарод — залаты дыплом міжнароднага фестывалю “КукАрт” (Санкт-Пецярбург), які арганізоўваецца Саюзам тэатральных дзеячаў Расійскай Федэрацыі. Нашы суайчыннікі выступілі з работай “Дзівосныя авантуры паноў Кубліцкага ды Заблоцкага”.

А крыху раней артысткі Людміла Чопарава і Вольга Яфрэмава-Кухарава атрымалі дыпломы лаўрэатаў фестывалю “Славянскія тэатральныя сустрэчы”, што праходзіў у Бранску, за найлепшую жаночую ролю.

І гэта хіба некалькі яскравых прыкладаў актыўнай дзейнасці Магілёўскага абласнога тэатра лялек.





— Сёлета пададзена рэкордная колькасць заявак. Летась іх было 32, цяпер 67, што сведчыць пра рост прэстыжу прэміі, — распавёў старшыня Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму **Міхаіл Партны**. — Важна адзначыць і высокі ўзровень майстэрства ўдзельнікаў гэтага года.

Экспертная камісія, якую ўзначальвала рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Наталля Карчэўская, вылучыла лаўрэатаў у кожнай з васьмі намінацый. Кандыдатуры аднагалосна былі зацверджаны Прэзідыумам галіновага прафсаюза.

## У МУЗЫЧНЫМ ВІХРЫ



**“Верхнядзвінскія музыкі”** названы найлепшымі ў намінацыі **“Музычнае мастацтва”**. Кіраўнік народнага ансамбля народнай музыкі **Мая Рубель** распавядае:

— Рэпертуар будуем на мясцовым матэрыяле. Кампазіцыі з Віцебшчыны складаюць асноўную частку, да якой дадаём мелодыі традыцыйных народных танцаў. Напрыклад, полькі, кадрылі, карагодаў.

Інструменты — адпаведныя. Аўтэнтычныя цымбалы, гармонік, жалейка, дудка, сапілкі. Артысты прыстасоўваюць і вясковыя побытавыя прадметы: гаршкі, чыгункі, мялкі-качалкі ды іншыя. А нядаўна вырашылі спалучыць старажытныя інструменты з сучаснымі. Так у арсенале калектыву з’явіліся класічныя цымбалы, саксафон, укулеле.

Па словах Маі Генадзьеўны, на перамогу ў конкурсе ансамбль не спадзяваўся: разумелі, што сапернічаць прыйдзецца з прафесійнымі музыкантамі.

— Вестка аб узнагародзе стала прыемнай нечаканасцю, — прызнаецца кіраўніца. — А тое, што менавіта “Верхнядзвінскім музыкам” выпаў гонар прадстаўляць не толькі наш раён, але і ўсю Віцебшчыну на вялікай сцэне, натхніла на новыя здабыткі.





## ПАЧУЦЦІ — ПРАЗ МАЛЮНАК

Найбольшая колькасць заявак паступіла ў намінацыі **“Жывапіс, скульптура, графіка, дызайн, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва”**. Сярод прэтэндэнтаў на прэмію — спрэс прафесіяналы. Таму навіну пра перамогу ў конкурсе ўдзельнікі **узорнай студыі выяўленчага мастацтва “Мара”** Цэнтра дзіцячай творчасці і народных рамёстваў з Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці сустрэлі з захапленнем.

Як заўважае кіраўнік калектыву **Вікторыя Ялец**, “Мара” — гэта сям’я. У ёй штогод займаецца больш за 30 чалавек ва ўзросце ад 3 да 17 гадоў. Цікаўныя хлопчыкі і дзяўчынкі чаруюць над паперай і малююць свае сусветы, выказваюць пачуцці і эмоцыі, раскрываюць здольнасці, а педагогі дапамагаюць у гэтым. Такім чынам у апекаванцах выхоўваецца любоў да прыгожага, развіваецца самастойнасць мыслення, яны вучацца разумець мастацтва.

Студыя вядзе выставачную дзейнасць: жыхары і госці Бярозаўшчыны час ад часу могуць азнаёміцца з работамі ўдзельнікаў “Мары” ў мясцовым музеі або Цэнтры культуры. Экспазіцыі ладзяцца і на раённых мерапрыемствах да прафесійных свят, педагагічных канферэнцыях, разнастайных форумах.

## СВАІМІ РУКАМІ

Сярод дзясятка канкурсантаў у намінацыі **“Народная творчасць”** члены журы аднагалосна адзначылі калектыў **Маладзечанскага раённага цэнтра рамёстваў**.

Установа была заснавана напрыканцы 1990-х і аб’яднала неабыякавых да народнай спадчыны ўмельцаў. Цягам амаль трох дзесяцігоддзяў супрацоўнікі цэнтра даследуюць нацыянальныя рамёствы, характэрныя для Мінскай вобласці, каб потым увасобіць веды ў вырабах. Да прыкладу, тут актыўна развіваецца выцінанка. Папяровыя шэдэўры аздабляюць сцэны устаноў культуры раёна. Шмат увагі надаецца і такім промыслам, як салома- і лозапляценне, інкрустацыя саломкай, вышыўка.

— Вырабы нашых майстроў упрыгожваюць сядзібы і кватэры, — расказвае кіраўніца цэнтра **Ларыса Ступіна**. — Многія прадметы цешаць вока не толькі землякоў, але і сяброў з блізкага і далёкага замежжа.

Разам з традыцыйнымі рамёствамі развіваюцца і сучасныя: напрыклад, бісерапляценне і фларыстыка.

# зацверджана аднагалосна

**Беларускага прафесійнага саюза
і турызму ў сферы культуры і мастацтва
Вызначаны пераможцы ў васьмі намінацыях.**











## КНІГА — КОЖНАМУ

У **бібліятэчнай справе**, абагнаўшы сем канкурэнтаў, стала лідарам **Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Карскага**. І не дзіва. Такой колькасцю праектаў, напэўна, мала хто можа пахваліцца. Прычым усе накіраваны на папулярызацыю чытання. Напрыклад, ініцыятыва "БІК: бібліятэка, інклюзія, культура" разлічана на тое, каб зацікавіць кнігай дзяцей з асаблівасцямі развіцця. Хлопчыкам і дзяўчынкам, якія абмежаваны ў пэўных дзеяннях, работнікі скарбніцы чытаюць услых. А потым агучанае абмяркоўваецца. Дарэчы, гэты праект атрымаў прэзідэнцкі грант.

Сярод дарослых чытанне прасоўваецца праз ініцыятыву "Кніга кожнаму, кніга для кожнага": сустрэчы з аматарамі літаратуры ладзяцца непасрэдна на прадпрыемствах, у арганізацыях і ва ўстановах. Як запэўніла дырэктар бібліятэкі **Марына Ігнатовіч**, гэта дзейсная мера. Пасля такіх імпрэз колькасць наведвальнікаў значна павялічваецца.

Да таго ж пастаянна праводзяцца гульні, віктарыны, квэсты па творах беларускіх і замежных аўтараў. Пры кніжнай скарбніцы ёсць аматарскія аб'яднанні для дарослых і дзяцей.

## ПАД ЗОРКАЙ СУВОРАВА

У **музейнай справе** найлепшым з шасці намінантаў аднагалосна названы **Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. Суворава**.

— На конкурс прадставілі матэрыялы па асноўнай дзейнасці і праекты, што рэалізоўваюцца ў нашай установе, — расказвае дырэктар **Алена Бабенка**.

Дзве пастаянныя экспазіцыі даступныя ў асобных памяшканнях. Першая, прысвечаная жыццю і дзейнасці вялікага палкаводца, знаходзіцца ў доме XVIII стагоддзя, які належаў Сувораву і дзе ён жыў у 1797-м і 1800-м. Залы знаёмяць з той эпохай, падрабязна даследуюць біяграфію генералісімуса, ролю ў гісторыі Беларусі і Кобрыншчыны. Дэманструюцца ўнікальныя калекцыі абмундзіравання, зброі, мэблі, прадметы побыту.

Другая пастаянная экспазіцыя, "7 стагоддзяў Кобрына", расказвае пра мінуўшчыну горада — ад 1287-га, калі ён упершыню ўпамінаецца ў летапісах, і да Вялікай Айчыннай вайны.

— Тут мы рэгулярна ладзім навуковыя канферэнцыі: "Суворaўскія чытанні" па дзейнасці палкаводца і "Мартынаўскія чытанні", якія прысвячаем першаму дырэктару музея Аляксею Мартынаву, — распавядае кіраўніца. — Да ўдзелу запрашаем не толькі прафесійных гісторыкаў, але і даследчыкаў-аматараў.

Спадчына Кобрыншчыны, як і ўсёй Беларусі, папулярызуецца і з дапамогай музейна-педагагічных заняткаў, тэматычных сямейных і групавых квэстаў, іншых формаў працы.

## НЯСІ КУЛЬТУРУ

У намінацыі **"Літаратура, журналістыка, крытыка"** узнагароду атрымала рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова **"Культура і мастацтва"**.

Дырэктар **Наталля Кузняцова** адзначыла, што за поспехам — карпатлівая праца моцнай, зладжанай каманды журналістаў, фотакарэспандэнтаў, іншых членаў калектыву, якія заўсёды імкнуцца ствараць якасны кантэнт.

— Наш дэвіз "Нясі культуру, жыві мастацтвам" актуальны сёння, заўтра і заўжды, — упэўнена Наталля Васільеўна. — І кожны наш работнік кіруецца гэтым прынцыпам. Рыхтуючы матэрыялы да публікацыі, мы імкнёмся, каб вы, нашы чытачы, з задавальненнем бралі ў рукі газету "Культура", часопіс "Мастацтва" і нязменна знаходзілі для сябе цікавую і карысную інфармацыю.

## ТЭКСТЫЛЬНАЯ ТРАДЫЦЫЯ

Лідарам у намінацыі **"Аматарская мастацкая творчасць"** стаў калектыў **Неглюбскага сельскага цэнтра ткацтва** Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці.

— Неглюбская тэкстыльная традыцыя — самабытная з'ява беларускай народнай творчасці, якая існуе дагэтуль, — расказвае майстрыха **Людміла Кавалёва**. — Асноўныя асаблівасці — разнастайнасць тэхнік ткацтва і вышыўкі, складаная паліхромія і багатыя арнаментальныя кампазіцыі. Неглюбскія ручнікі вядомыя далёка па-за Гомельшчынай.

Спрадвеку іх выраблялі ў адценнях чырвонага, чорнага, белага і ўпрыгожвалі цудоўным арнаментальным фонам. Супрацоўнікі цэнтра беражліва захоўваюць традыцыю продкаў, папулярызуючы яе сярод жыхароў і гасцей Беларусі.

Акрамя ручнікоў, у Неглюбцы ствараюць і рознакаляровую пасцельную бялізну, і абрусы, і кутнія чахлы, а таксама адмысловыя элементы адзення.

— Ці спадзяваліся на перамогу? — перапытвае Людміла Васільеўна. — Вядома ж! Інакш, напэўна, не ўдзельнічалі б. Стала яна для нас прыемнай нечаканасцю? Так. Мы разумелі, што канкурэнтаў будзе шмат і што кожны варты самай высокай узнагароды.

**Ірына СТАНКЕВІЧ**
Фота з архіваў устаноў